# Каб свет душы не згас

**_ЁСЦЬ на свеце людзі, у душах якіх сапраўды ніколі не згасае святло чалавечай мудрасці, якой шчодра дзеляцца са сваімі захавальнікамі лепшыя чалавечыя сябры — кнігі. Людзі гэтыя — бібліятэчныя работнікі — пасрэднікі паміж аматарамі чытання і мільёнамі разумных незабыўных старонак друкаванай скарбніцы. Нарэшце, каштоўны ўклад іх сціплай працы ацэнены па праву і вось другі ўжо год запар прадстаўнікі бібліятэчнай прафесіі адзначаюць сваё прафесійнае свята._**



Як і летась — прыгожы вераснёўскі дзень падарыла прырода віноўнікам урачыстасці. Сонечнай раніцай гасцінна адчыніліся дзверы раённай бібліятэкі, дзе ва ўтульнай зале добразычліва сустракалі сваіх калег і запрошаных гасцей супрацоўнікі раённай установы культуры. Паглядзець тут было на што: вабіла вочы рознакаляровая палітра кветак вакол будынка, у сценах — цікавая тэматычная выстава "Каб свет душы не згас", на гасцінных сталах— кулінарныя прысмакі і дзівосныя вырабы разнастайнай народнай творчасці, якія прынеслі ўмельцы на святочную сустрэчу сяброў.

Нарэшце, распачалася афіцыйная частка ўрачыстага мерапрыемства. Вядучыя Аксана Пунінская і Наталля Няхай павіншавалі калег і прадаставілі слова загадчыцы раённага аддзела культуры Р.Л.Рэут. Руслана Леанідаўна адзначыла, што ўжо тры гады запар па выніках спаборніцтва аддзел культуры займае ў вобласці другое месца і амаль палова гэтага поспеху на рахунку калектыва раённай цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы, яе загадчыцы Галіны Аляксандраўны Казловіч. Многа ўдзячлівых і сапраўды заслужаных слоў прагучала ў адрас і старэйшых работнікаў сістэмы, і маладзенькіх бібліятэкараў, добрасумленнасцю даказаўшых адданасць прафесіі. Лепшым з лепшых былі ўручаны Ганаровыя граматы і грашовыя прэміі, а калектыў Мінскай РЦБС ад аддзела культуры атрымаў у падарунак ксеракс.

Шчыра павіншавала з прафесійным святам раённых калег загадчыца навукова-метадычнага аддзела абласной бібліятэкі імя Пушкіна В.А. Малюга. Колькі цудоўных людзей, сапраўдных творцаў працуе ў сціплых вясковых бібліятэчных установах. Нездарма ж бібліятэкары Мінскага раёна дастойна прымалі ўдзел у абласных і рэспубліканскіх конкурсах. На выставе "Маё натхненне" ўсіх уразілі творчыя работы Таццяны Бей — загадчыцы Каладзішчанскай СБ №2, а калектыў бібліятэкі пас. Лясны стаў переможцам адзінаццатага рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры".





Вось ужо некалькі гадоў Мінская РЦБС супрацоўнічае з выдавецтвам "Современное слово". Прадстаўнікі гэтага выдавецтва былі на свяце і ўрачыста павіншавалі нас таксама.

Асабліва шчырыя, цёплыя словы былі сказаны ветэранам бібліятэчнай справы, якія адпрацавалі ў раёне больш за 25 гадоў, — Л.У. Пальчык (Крупіцкая б-ка), Л.В.Вайдылевіч (Чачкаўская б-ка), Р.І Дубовік (Каладзішчанская б-ка №1), В.Р. Раеўская (Старынская б-ка), Л.У. Куцаевай (Траскоўшчынская б-ка), В.В. Дзёмух (Лашанская б-ка).

Свята працягвалася. За ўрачыстасцямі— невялікі святочны канцэрт, падрыхтаваны творчым калектывам раённай бібліятэкі. Пад кодавай назвай "А ў нас у бібліятэцы" пачалося прадстаўленне талентаў, якое адкрылі маладыя спецыялісты. Дарэчы, віншавалі іх з уступленнем у прафесію і добрымі пажаданнямі, гасцінна прынялі ў сям'ю культработнікаў.

Як у тэатральнай зале, прысутныя з усмешкамі і падтрымкамі гучнымі апладысментамі сустракалі выступленні кожнага выканаўцы — і з раённай установы, і з сельскіх бібліятэк. Вельмі цікава, што асабліва спадабалася, павіншавалі сваіх калег работнікі культуры Каладзішчанскага і Ждановіцкага сельскіх Дамоў культуры.

Свята, безумоўна, адбылося, дзякуючы гаспадарам-арганізатарам гэтага мерапрыемства. З вясёлым настроем, падарункамі, шчырымі пажаданнямі ад'язджалі па сваіх адрасах сельскія бібліятэкары, каб і далей весці прапаганду кнігі, каб, як у Храм, прыходзілі ў бібліятэку людзі на спатканне з яе Вялікасцю Кнігай, бо яна — ёсць жыццё нашага часу.

**Любоў КВІТЧАНКА,**
**старшыня раённай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў культуры.**

**– 27 верас.**